*Тэма 4 ШЛЯХІ АНАЛІЗУ ЛІТАРАТУРНАГА ТВОРА*

1 Паслядоўны шлях аналізу.
2 Павобразны шлях аналізу мастацкага твора.
3 Праблемна-тэматычны шлях аналізу.
4 Кампазіцыйны шлях аналізу.
5 Другарадныя шляхі аналізу.

Ва ўмовах урока немагчымы комлексны філалагічны аналіз твора, таму адна з асаблівасцей школьнага аналізу – выбіральнасць. Немагчыма з аднолькавай мерай глыбіні штораз разглядаць усе элементы кожнага тэксту. Аднак адбор важнейшых праблем і даступных для вучняў ракурсаў разгляду мастацкага твора не павінен прыводзіць да скажэння яго зместу. **Шлях аналізу мастацкага твора** – гэта спецыфічная паслядоўнасць, ход разбору тэксту, выбар цэнтральнага аб’екта, пакладзенага ў аснову аналізу.

Сённяшняя метадычная навука прапаноўвае дзесяць шляхоў аналізу мастацкага тэксту ў школе. Кожны з іх мае свае вартасці і недахопы. Таму настаўнік павінен ведаць спецыфіку кожнага і пры выбары ходу разбору ясна ўсведамляць, які канкрэтны шлях аналізу будзе найбольш прыдатны для вывучэння таго ці іншага твора.

## 1 Паслядоўны шлях аналізу

**Паслядоўны шлях аналізу** (“услед за аўтарам”) з’яўляецца самым распаўсюджаным і прадугледжвае разгляд асобных частак (эпізодаў, актаў, строф) у той паслядоўнасці, у якой яны размешчаны ў творы. Патрабуе ўзнаўлення ўрыўка шляхам каменціраванага чытання ці падрабязнага пераказу і шматузроўневага зместава-фармальнага аналізу тэксту. Абавязковым з’яўляецца спалучэнне аналізу з сінтэзам, г. зн. высвятленне ўзаемасувязі паміж часткамі тэксту, значэння кожнай з іх для раскрыцця задумы твора праз пытанні на абагульненне. Прыдатны пры вывучэнні лірыкі, невялікіх драматычных і малых эпічных твораў, тэкстаў з прамым парадкам сюжэтабудовы (без рэтраспекцый). Забяспечвае натуральнасць і лагічнасць ходу аналізу дзякуючы індуктыўнаму прынцыпу (ад назіранняў да абагульненняў). Можа быць выкарыстаны пры вывучэнні апавядання З. Бядулі “На Каляды к сыну”, верша “Шчасце” М. Танка, “Хто смяецца апошнім” К. Крапівы і інш. З’яўляецца прывабным і таму, што адпавядае ўспрыманню тэксту, блізкаму да натуральнага чытання. Акрамя таго, ён дазваляе арганізаваць паўторнае чытанне твора на ўроку і дзякуючы сваёй дэталёвасці прывучае дзяцей да ўдумлівага, асэнсаванага чытання.

**Недахопы:**
- неэканомнасць;
- пагроза ператварэння аналізу ў пераказ тэксту;
- небяспека страты цэласнага ўяўлення пра канцэпцыю твора.

## 2 Павобразны шлях аналізу мастацкага твора

**Павобразны шлях** грунтуецца на вызначэнні ідэйнага зместу і маральна-этычных пытанняў праз сістэму вобразаў-персанажаў, а таму адыгрывае і значную выхаваўчую ролю. У цэнтры такога аналізу – маральныя калізіі. Сапраўды, праз герояў і іх узаемаадносіны пісьменнік выяўляе свае ідэалы, ставіць і вырашае надзённыя праблемы. Аднак гэта не азначае адмаўлення, як ужо гаварылася вышэй, іншых элементаў мастацкага тэксту. Гэта самы ўніверсальны і эканомны шлях аналізу, прыдатны для твора любога аб’ёму і жанру. З дапамогай гэтага шляху можа быць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

разгледжана і паэма Я. Купалы “Курган”, і аповесць “Жураўліны крык” В. Быкава, і апавяданне “У старых дубах” Я. Коласа, і раман “Каласы пад сярпом тваім” У. Караткевіча”, і п’еса “Пінская шляхта” В. Дуніна-Марцінкевіча. На яго карысць гаворыць і адпаведнасць узроставым запатрабаванням вучняў, для якіх асэнсаванне канкрэтных аспектаў – учынкаў, паводзін, падзей – з’яўляецца найбольш лёгкім.

**Недахопы:**

- ✓ магчымасць ізаляванага разгляду героя, у адрыве ад сістэмы вобразаў і іншых кампанентаў тэксту;
- ✓ небяспека распаду цэласнасці твора;
- ✓ небяспека пераходу да абмеркавання адцягненых этычных пытанняў.

Нельга абмяжоўвацца толькі выяўленнем чалавечай сутнасці герояў, трэба паказаць мастацкія прыёмы іх стварэння, праз якія і выяўляецца індывідуальна-аўтарская манера. Вынікам павобразнага аналізу з’яўляецца характарыстыка героя ў вуснай, графічнай ці пісьмовай (сачыненне) форме. Характарыстыка мае на мэце раскрыць асноўныя рысы характару героя, паказаць, як яны ўплываюць на паводзіны, якую ролю вобраз мае ў агульнай мастацкай задуме твора. Яна павінна вызначацца паўнатой, канкрэтнасцю, аргументаванасцю, каб не ператварыцца ў схему. Віды характарыстыкі: індывідуальная, параўнальная, групавая.

**Характарыстыка** павінна ахопліваць:

1) “біяграфію” героя, усё, што мы ведаем пра яго з тэксту;

2) псіхалагічную характарыстыку;

- аўтарская характарыстыка;
- партрэт;
- мова героя;
- учынкі героя;
- самаацэнка і ацэнка іншымі персанажамі;
- апісанне інтэр’еру і рэчаў, што належаць герою;
- пейзаж;
- пачуцці і перажыванні, думкі, мары;
- імя, прозвішча, мянушка;
- статычнасць або эвалюцыя вобраза;

3) мастацка-эстэтычнае значэнне:

- ➢ ідэйная накіраванасць вобраза, значэнне яго для раскрыцця мастацкай задумы твора;
- ➢ тыповыя рысы характару персанажа і сродкі тыпізацыі;
- ➢ індывідуальныя рысы, спалучэнне сродкаў тыпізацыі і індывідуалізацыі;
- ➢ гістарычная канкрэтнасць вобраза, яго сувязь з пэўнай эпохай;
- ➢ эстэтычная функцыю, пачуцці і перажыванні, якія выклікае вобраз у чытача.

Зразумела, што не ўсе пункты гэтага плана даступны для разумення дзяцей 5 ці 6 класа. Выбіраючы ход аналізу, настаўнік павінен абавязкова суаднесці ўзровень яго складанасці з узроставымі асаблівасцямі вучняў.

## 3 Праблемна-тэматычны шлях аналізу

**Праблемна-тэматычны шлях** мае два бакі рэалізацыі:

1 аб’ектам аналізу становяцца філасофскія, сацыяльныя, этычныя, аксіялагічныя, эстэтычныя праблемы;

2 сама тэхналогія грунтуецца на пастаноўцы і вырашэнні праблемных пытанняў і сітуацый, аргументацыі высноў.

**Вартасці**:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- дазваляе глыбока пранікнуць у ідэйны змест твора;
- актывізуе мысленчую дзейнасць, выхоўвае ўменне аргументаваць, абагульняць, фарміруе маўленчую культуру.

**Цяжкасці і выдаткі**:
- магчымасць пераходу да адцягненых разважанняў;
- няўвага да дэталей, немагчымасць ахапіць другарадныя элементы.

Выкарыстоўваецца пераважна пры вывучэнні твораў сярэдняй і буйной эпічнай формы, драматургіі. У гэтых творах, што вывучаюцца цягам некалькіх урокаў, як правіла, пастаўлена шмат праблем. Аднак праблемна-тэматычны шлях можа выкарыстоўвацца і пры вывучэнні філасофскай лірыкі, скажам, вершаў "Шчасце" М. Танка, "Чалавеку патрэбна не слава…" С. Грахоўскага, апавяданняў з глыбокай філасофскай асновай ("Memento mori" Я. Брыля). Пачынаецца з пастаноўкі магістральнага праблемнага пытання, якое стане скразным да вывучэння ўсяго твора і адказ на якое адразу даць немагчыма. Калі разгляду твора прысвечана некалькі ўрокаў, на кожным з іх ставіцца сваё, прыватнае, пытанне, па вырашэнні якога ідзе работа.

Прыклад суадносін магістральнага і прыватных пытанняў.
Магістральнае: "Чаму твор называецца «На ростанях?»"
Прыватныя:
Інтэлігентны чалавек: хто ён?
Чаму разышліся шляхі Лабановіча і Ядвісі? і г. д.

Магістральныя пытанні могуць быць пастаўлены самім пісьменнікам у загалоўку: "Хто смяецца апошнім?" К. Крапівы, "Memento mori" Я. Брыля, "На ростанях" Я. Коласа, "Сэрца на далоні" І. Шамякіна і інш. Іх можа сфармуляваць настаўнік: Пятрок і Сцепаніда Багацькі: ахвяры ці героі? ("Знак бяды" В. Быкава). У якасці праблемнага пытання можа быць выкарыстана выказванне даследчыка творчасці ці словы самога аўтара: Чаму І. Мележ назваў свой раман лірычным?

**МПФ**: эўрыстычная і вольная гутаркі, праблемныя пытанні, сітуацыі, каментар эпіграфа, параўнанне, выбарачнае чытанне і інш. Для аргументаванасці думак варта надаваць увагу і цытатам з крытычных артыкулаў, інтэрв'ю, успамінаў і г. д.

## 4 Кампазіцыйны шлях аналізу

**Кампазіцыйны шлях** накіраваны на асэнсаванне зместу праз падрабязнае вывучэнне мастацкай арганізацыі тэксту. У 5–7 класах рэалізуецца праз складанне плана і аналіз кожнай часткі як неад'емнага элементу мастацкага цэлага.

У 8 – 11 класах аналіз **кампазіцыі** ўключае
- сюжэт: этапы развіцця дзеяння (экспазіцыя, завязка, развіццё дзеяння, кульмінацыя, развязка, эпілог); храналогію падзей (прамую ці рэтраспектыўную арганізацыю);
- пазасюжэтныя элементы (лірычныя адступленні: успамін, роздум, апісанні: пейзаж, інтэр'ер, партрэт);
- групоўку вобразаў;
- устаўныя элементы (легенды, песні, лісты, дакументы і інш.);
- чляненне твора на часткі (раздзелы);
- апавядальніка і яго ролю ў творы;
- рамачныя кампаненты тэксту (назва, прысвячэнні, эпіграфы і інш.);
- дыялог, маналог, дэталь, масавая сцэна і інш.

Вынікам можа стаць складанне табліцы-схемы сюжэтна-кампазіцыйнай структуры твора і паказ важкасці кожнага элемента для раскрыцця мастацкай задумы. Іншымі словамі, паказаць, што ўсе кампаненты тэксту гарманічна спалучаны і выкінуць ці пераставіць што-небудзь немагчыма без парушэння арыгінальнасці твора (з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выхаваўчага боку – пераканаць у немэтазгоднасці чытання твораў у скарочаным выглядзе)

Да прыкладу, табліца паводле твора М. Гусоўскага “Песня пра зубра”:

| **Пункт плана** (заўвага: план павінен быць падрабязны) | **Кампаненты кампазіцыі** |
|---|---|
| 1 Карыда і паляванне на зубра | Экспазіцыя, пазасюжэтны элемент, успамін, гісторыя напісання паэмы; |
| 2 Зубр – сімвал Беларусі | Пазасюжэтны элемент, апісанне пейзажу, “партрэт” зубра; |
| 3 Зубрыны статак – мадэль ідэальнага грамадства і сям’і | Завязка, падзея і г. д. ………………………………………… |

Пры складанні такой табліцы абавязкова даецца вусная характарыстыка кожнаму пункту плана, высвятленне ролі гэтага элемента ў выяўленні ідэйнага зместу твора. Гэты шлях аналізу выбіраецца для твораў са складанай ці незвычайнай кампазіцыйнай будовай (“Пошукі будучыні” К. Чорнага, “Аблава” В. Быкава, “Плачка” Я. Баршчэўскага, “Песня пра зубра” М. Гусоўскага, “Курган” Я. Купалы, “Сымон-музыка” Я. Коласа і інш.). Але ён, як і паслядоўны, вельмі марудны.

Такім чынам, кампазіцыйны шлях аналізу павінен паказаць вучню непаўторнасць аўтарскага падыходу да жыццёвага матэрыялу.

## 5 Другарадныя шляхі аналізу

У сучаснай метадычнай навуцы існуюць і менш распаўсюджаныя (скрыты, аглядавы, свабодны) і тыя, што раскрываюць прыватныя аспекты (лінгвістычны, стылёвы, тэксталагічны), шляхі аналізу мастацкага тэксту, выкарыстоўваюцца ў межах камбінаванага.

**Скрыты шлях** падразумявае пранікненне ў тэкст праз выкананне творчых работ (стварэнне ці аналіз ілюстрацый, славеснае маляванне, складанне кадрапланаў, кінасцэнарыяў, аналіз спектакляў, музычных твораў, карцін, асновай для якіх стаў літаратурны тэкст). Гэта найменш традыцыйны шлях аналізу. Да прыкладу, урок будуецца на параўнанні песні на словы А.Куляшова “Бывай” і самога верша. Задача: прасачыць інтанацыйную блізкасць, адметнасць сродкаў музычнай і паэтычнай выразнасці. Выкарыстоўваецца пераважна пры вывучэнні лірыкі і невялікіх па аб’ёме твораў. Вартасці: развіццё творчай актыўнасці дзяцей, культуралагічны падыход. Недахоп – небяспека адыходу літаратурнага твора на другі план.

**Аглядавы шлях** прадугледжвае разгляд пастаўленага настаўнікам кола пытанняў (сістэма вобразаў, праблематыка ці кампазіцыя) у агульных рысах, без увагі да дэталяў. У 6–8 класах выкарыстоўваецца пры вывучэнні твораў, якія падаюцца праграмай для самастойнага чытання, у 9–11 класах – пры манаграфічным вывучэнні лірыкі. Скажам, у 9 класе пры вывучэнні тэмы “Беларуская літаратура і антычнасць” (1 гадзіна) для самастойнага прачытання прапанаваны 2–3 міфы Старажытнай Грэцыі, урыўкі з “Адысеі” Гамера, “Энеіды” Вергілія, “Прыкутага Праметэя” Эсхіла. Зразумела, што пра дэталёвы разбор на адным уроку гэтых тэкстаў размовы быць не можа. Для аналізу гэтых твораў прыдатны і **свабодны шлях,** які адрозніваецца ад аглядавага большай самастойнасцю вучняў, іх суб’ектыўна-асобаснымі адносінамі да твора і момантамі імправізацыі на ўроку.

**Стылёвы шлях** накіраваны на адметнасці індывідуальнага стылю аўтара, пад чым разумеюць агульны модус мастацкасці яго творчасці (лірычны, элегічны, драматычны, камічны, трагічны і г. д.), мастацкі метад (рамантызм, рэалізм і г. д.), спецыфіку вобразна-выяўленчых сродкаў (эпітэтаў, метафар, параўнанняў, сімволікі і г. д.) і стылістычных фігур з абавязковым вызначэннем іх функцыі. Работа з тропамі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

на ўроку носіць назву слоўнікавай работы. Звычайна настаўнікі даюць заданні кшталту: “Знайдзіце ў вершы эпітэты, метафары, параўнанні”. Вучні з лёгкасцю знаходзяць тропы, і на гэтым работа з моўнымі сродкамі на ўроку заканчваецца. Такі падыход з’яўляецца грубай памылкай і не мае ніякага дачынення да аналізу твора. Знаходжанне мастацкіх сродкаў не павінна стаць самамэтай. Выразнае ўяўленне пра індывідуальны стыль пісьменніка дае назіранне за тым, якія часціны мовы пераважаюць у творы (асабліва ў адносінах да дзеясловаў ці іх адсутнасці), якая будова сказаў для яго характэрна. Слоўнікавая работа ўключае і стылістычныя практыкаванні: падбор сінонімаў, антонімаў, какаграфію, стылістычны эксперымент.

**Лінгвістычны шлях** накіраваны на аналіз моўных цяжкасцей у мастацкім тэксце. Слоўнікавая работа праводзіцца на розных этапах вывучэння твора, часам некалькі разоў на ўроку, бо незразумелыя словы могуць прывесці да скажонага ўспрымання тэксту. Незразумелымі могуць быць словы, з якімі дзеці ніколі не сустракаліся (нават на погляд настаўніка лёгкія), архаізмы і гістарызмы (лёкай, асэсар, сярмяга і інш.), дыялектызмы, мнагазначныя словы і амонімы; аўтарскія наватворы, словы іншамоўнага паходжання і інш.

Спосабы тлумачэння слоў выбірае настаўнік, улічваючы патрабаванне іх мэтазгоднасці і чаргавання:
1 пераклад іншамоўнага слова на беларускую мову (*пакгауз – склад*);
2 праз сінонім (*батагі – палкі, астрог – турма, але не карчма – шынок*);
3 азначэнне (*лёхі – падземныя норы; каня – балотная чайка*);
4 этымалогію, зварот да кораня слова (*умаіць – зрабіць прыгожай, як май*);
5 дэманстрацыю: паказ рэчы ці яе выявы (*канюшына, касач, чомга*);
6 апісанне (*сярмяга – верхняя вопратка з саматканага сукна*);
7 увядзенне ў кантэкст (*скласці сказ, асабліва для амонімаў*);
8 працу з тлумачальным слоўнікам;
9 паведамленне падрыхтаванага вучня (апераджальнае заданне);
10 антонімы (*волкі – сухі*);
11 выразнае чытанне (*эх, ты, нябога*! – са спачуваннем).
12 пераклад на рускую мову;

Тлумачачы словы, нельга вырываць іх з кантэксту і разглядаць у адрыве ад таго значэння, якое яно мае ў выяўленні ідэйнага зместу твора. Гэта шкодна не толькі для разумення твора, але і для запамінання яго вучнямі. Новае слова мацней засвойваецца, калі з ім звязаны пэўныя асацыяцыі, вобразы, падзеі. Акрамя таго, трэба дабівацца актыўнага выкарыстання новых слоў.

**Тэксталагічны шлях** прадугледжвае зварот да творчай лабараторыі пісьменніка (гісторыі напісання, прататыпаў, параўнанне розных рэдакцый твора, варыянтаў назвы, сцэнічнай гісторыі п’есы, атрыбуцыі ананімных твораў, псеўданіма аўтара і інш.). У адрозненне ад падобнай інфармацыі, выкарыстанай на ўступным этапе, мэта якога зацікавіць клас асобай аўтара і заахвоціць да прачытання тэксту, у працэсе аналізу адбіраецца такі матэрыял, які дазволіць глыбей раскрыць ідэю твора (тыя ж варыянты назвы), спасцігнуць індывідуальны стыль пісьменніка (розныя рэдакцыі) і г. д.

**Выснова:** задача настаўніка – выбраць найбольш аптымальны шлях аналізу, кіруючыся спецыфікай тэксту, узроставымі асаблівасцямі дзяцей, а таксама тым, якім шляхам аналізаваўся папярэдні твор; правесці аналіз на адпаведным узроўні; памятаць, што любы шлях аналізу азначае толькі выбар цэнтральнага аб’екту і не азначае ігнаравання іншых пластоў твора. Пры вывучэнні вялікіх па аб’ёме твораў нярэдка аддаецца перавага камбінаванаму шляху аналізу, які ўяўляе сабой спалучэнне некалькіх шляхоў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ